Аляксандр МАКАРЭВІЧ

# ПРАБЛЕМНАЕ ВЫКЛАДАННЕ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў X—XI КЛАСАХ ПА СІСТЭМЕ ПЕРСПЕКТЫЎНЫХ ЛІНІЙ

*Заканчэнне. Пачатак у № 9, 10*

III. К. **Чорны.** Апавяданні «Вераснёвыя ночы», «Справа Віктара Лукашэвіча», раман «Зямля»[1], аповесць «Лявон Бушмар», раман «Трэцяе пакаленне».

Пры ўсёй складанасці сучасных ацэнак творчасці К. Чорнага, у прыватнасці рамана «Трэцяе пакаленне», усё ж, думаецца, гэты твор немэтазгодна абыходзіць увагай пры вывучэнні гісторыі літаратуры ў старэйшых класах сярэдняй школы. Пры гэтым, відаць, неабходна ўлічваць спецыфіку канцэптуальнага адлюстравання аўтарам супярэчлівай рэчаіснасці 20—30-х гг., ідэйную канцэпцыю пісьменніка, якая паўстае перад рэцыпіентам толькі пасля ўспрымання сукупнасці твораў, у кожным з якіх даецца новая мастацкая падсветка роднасным сацыяльным з'явам, тыпам і г. д. У гэтым сэнсе вывучэнне творчасці К. Чорнага больш прымальным бачыцца ў варыянце, прапанаваным праграмай для сярэдняй школы па беларускай літаратуры[2].

**Прыкладнае перспектыўнае планаванне ўрокаў.**

1—2-ая гадзіны. К. Чорны. Характарыстыка жыцця і творчасці. Форма ўрокаў — лекцыя, іх структура можа быць аналагічнай заняткам па вывучэнні творчасці Я. Купалы. Адна з задач настаўніка — давесці вучням, што ў сучасным літаратуразнаўстве няма поўнага адзінства ў ацэнках твораў К. Чорнага, у прыватнасці рамана «Трэцяе пакаленне». У сувязі з гэтым мэтазгодна звярнуцца да палемікі паміж Т. Грамадчанкай, А. Ленсу, М. Мушынскім[3], артыкула І. Жука[4], іншых публікацый М. Мушынскага[5].

3-я гадзіна. К. Чорны. Характарыстыка жыцця і творчасці. Аповесць «Лявон Бушмар». Форма ўрока — камбінаваная. Мэты ўрока паўтараюць мэты папярэдніх у кантэкстуальным іх варыянце.

**Структура ўрока і пытанні да яго:**

1. Перспектыўныя мэтавыя ўстаноўкі.
2. Дамашняе заданне да наступнага ўрока.
3. Пісьмовыя адказы 3-х вучняў на пытанне «Характарыстыка жыцця і творчасці К. Чорнага».
4. Літаратуразнаўчы аналіз аповесці «Лявон Бушмар».
5. Абагульненні і вывады па ўроку.

4—6-ая гадзіны. К. Чорны. Раман «Трэцяе пакаленне».

Урок пазакласнага чытання. К. Чорны. Раман «Бацькаўшчына».

7-ая гадзіна. Урок па развіцці мовы.

**Перспектыўныя мэты гэтага ўрока:** а) падрыхтоўка да напісання першага варыянта сачынення па творчасці К. Чорнага; б) назапашванне фактычнага матэрыялу да сачыненняў у XI класе па творчасці І. Мележа, В. Быкава; в) падрыхтоўка да выпускнога экзамену.

**Магчымыя тэмы сачыненняў па творчасці К. Чорнага, рэкамендацыі да іх:**

1. Чытаючы творы К. Чорнага... (аб маіх уражаннях і вывадах, якія ўзніклі пасля чытання твораў К. Чорнага «Лявон Бушмар», «Бацькаўшчына», «Трэцяе пакаленне»).

2. Розныя тыпы заможных гаспадароў у творах К. Чорнага «Лявон Бушмар», «Бацькаўшчына», «Трэцяе пакаленне».

3. Чаму не былі патрэбнымі новай уладзе гаспадары тыпу Бушмара, Скуратовіча, а затым і Тварыцкага?

Заўвага: звярнуць увагу на такія факты: Бушмар і Скуратовіч — прадстаўнікі заможных гаспадароў, якія сталі на ногі яшчэ да рэвалюцыі, Тварыцкі ж займеў моцную гаспадарку ў выніку некаторых падзей рэвалюцыі; аднак і першыя, і другі не задавальнялі новую ўладу.

4. Адлюстраванне лёсу жанчыны ў перад- і паслярэвалюцыйны час у творах К. Чорнага «Лявон Бушмар», «Бацькаўшчына», «Трэцяе пакаленне».

Заўвага: неабходна звярнуцца да вобразаў Амілі, Галены («Лявон Бушмар»), Марылькі Гушкі («Бацькаўшчына»), Зосі Тварыцкай, Ірыны Назарэўскай («Трэцяе пакаленне») — прадстаўніц другога пакалення ў гэ-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

тых творах, а таксама — да вобразаў Скуратовічыхі, маці Лявона Бушмара, маці Марылькі Гушкі — прадстаўніц першага пакалення ў творах К. Чорнага.

5. Розныя шляхі другога пакалення ў творах К. Чорнага «Лявон Бушмар», «Бацькаўшчына», «Трэцяе пакаленне».

Заўвага: неабходна звярнуцца да вобразаў Лявона Бушмара (аднайменная аповесць), Антуся, Адася, Марылькі Гушкаў («Бацькаўшчына»), Міхала, Зосі («Трэцяе пакаленне»), прасачыць рознасць жыццёвых шляхоў, абраных гэтымі людзьмі, зрабіць невялікае параўнанне з сапраўднымі фактамі той рэчаіснасці, якая адлюстравана ў названых творах.

У сувязі з азначанымі ў пункце «б» перспектыўнымі мэтамі гэтага ўрока прывядзем прыклады магчымых тэм сачыненняў для XI класа і рэкамендацый да іх (творчасць І. Мележа, В. Быкава):

I. Розныя тыпы заможных гаспадароў у «Палескай хроніцы» І. Мележа.

Рэкамендацыі:

1. Параўнаць прынцыпы адлюстравання супярэчлівых падзей паслярэвалюцыйнай рэчаіснасці ў гэтым і іншых творах беларускай (К. Чорны: «Лявон Бушмар», «Бацькаўшчына», «Трэцяе пакаленне»), а таксама рускай савецкай літаратуры.

2. Ахарактарызаваць: а) агульнае і адрознае ў характарах прадстаўнікоў розных тыпаў заможных гаспадароў: Халімона Глушака, Ігната Нібыта, Васіля Дзятла; б) станаўленне гаспадаркі кожнага з іх: калі адбывалася закладванне яе асноў, хто ў гэтым прымаў удзел, рознасць шляхоў і спосабаў дасягнення мэт; в) рэальнае становішча спраў у гаспадарках гэтых сялян, іх погляды, арыентацыі на ідэал моцнага гаспадара; прасачыць, ці адпавядае другое першаму ў жыцці Халімона, Ігната, Васіля.

3. Параўнальная характарыстыка адносін Халімона, Ігната, Васіля да перадзелу зямлі, калектывізацыі, землеўпарадкавання, да кіраўнікоў мясцовага і раённага маштабу.

4. Адносіны да гэтых сялян куранёўцаў, кіраўнікоў мясцовага, раённага маштабу; параўнайце з адносінамі да Бушмара, Скуратовіча, Тварыцкага.

5. Чаму і адзін, і другі, і трэці тып моцных гаспадароў не задавальняў новую ўладу, чаму не былі патрэбнымі ёй такія гаспадары, чаму новая ўлада абапіралася на гаспадароў тыпу Міканора, Хоні, Зайчыка і інш.?

6. У чым спадзяванні Халімона, Ігната, Васіля на лепшую будучыню; параўнайце з марамі Бушмара, Скуратовіча, Тварыцкага.

7. Заключэнне: мастацкая функцыя гэтых характараў у сістэме вобразаў, у адлюстраванні праблем паслярэвалюцыйнай рэчаіснасці ў «Палескай хроніцы» І. Мележа.

II. Адлюстраванне падзей перыяду калектывізацыі ў «Палескай хроніцы» І. Мележа і «Знаку бяды» В. Быкава.

1. Параўнаць прынцыпы паказу супярэчлівых падзей паслярэвалюцыйнай рэчаіснасці ў «Палескай хроніцы» І. Мележа, «Знаку бяды», «Аблаве», «Сцюжы» В. Быкава і іншых творах беларускай савецкай літаратуры.

2. Ахарактарызаваць спосабы правядзення калектывізацыі ў творах І. Мележа, В. Быкава.

3. Адносіны простага сялянства да калектывізацыі, вясковыя актывісты ў гэтых падзеях.

4. Мастацкія прыёмы і сродкі раскрыцця характараў сялянства ў гэтых творах.

5. Ваша разуменне падзей і характараў у гэтых творах *.

* Побач з гэтымі тэмамі, вядома, павінны быць і іншыя, разлічаныя на іншы ўзровень падрыхтаванасці вучняў.

## ВЫВУЧЭННЕ ЛІТАРАТУРЫ Ў XI КЛАСЕ

**Этапы і формы звароту да мастацкай версіі гістарычнага факту ў мастацкай літаратуры.**

На прыкладзе звароту да вывучэння ў XI класе такой з'явы ў літаратуры, як мастацкая версія гістарычнага факту, прасочым, як можна адначасова здзяйсняць паўтарэнне пройдзенага ў IX класе, вывучэнне новага матэрыялу і факталагічнае назапашванне для такіх аглядавых тэм, як сучасная беларуская паэзія, проза, драматургія:

1. Яшчэ ў IX класе пры вывучэнні, напрыклад, жыцця і творчасці П. Багрыма, К. Каліноўскага, Ф. Багушэвіча настаўнік мусіць звярнуць увагу вучняў на існаванне ў беларускай літаратуры мастацкай версіі жыцця і дзейнасці гэтых асоб, назваць творы аб гэтых дзеячах: У. Караткевіча, А. Куляшова, В. Хомчанкі і іншых (да іх вучні будуць звяртацца ў XI класе). А таму ў IX класе мэтазгодна параіць ім падрыхтаваць канспекты пра жыццё і творчасць гэтых паэтаў у праблемным іх асвятлен-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ні з тым, каб выкарыстаць іх затым ў XI класе.

2. У агляданай гутарцы (лекцыі) па творчасці А. Куляшова мэтазгодна звярнуць увагу вучняў на яго паэму «Х а м у ц і у с» аб рэвалюцыйнай дзейнасці К. Каліноўскага. Можна таксама даць азначэнне паняццю «мастацкая версія гістарычнага факту», каб ужо пры вывучэнні твораў У. Караткевіча на гістарычную тэму больш звяртацца да прадметнага аналізу фактаў гісторыі і іх мастацкага асвятлення ў літаратуры.

Мастацкая версія гістарычнага факту — праблемнае адлюстраванне жыцця і дзейнасці рэальнай гістарычнай асобы з характэрным для яго мастацкім вымыслам, мастацкай канцэпцыяй у вытлумачэнні нявысветленых ці супярэчлівых фактаў жыцця рэальнай гістарычнай асобы.

3. Вывучэнне творчасці У. Караткевіча можна пачынаць традыцыйна: з агляданай гутаркі (ці лекцыі). Пры гэтым неабходна звяртацца да фармавання ў вучняў мэтавай установкі на ўспрыманне жыцця і творчасці пісьменніка: выразна акцэнтаваць увагу на яго грамадзянскай і эстэтычнай пазіцыі ў жыцці і мастацтве, на жанравых і тэматычных кірунках творчасці, стылёвых асаблівасцях твораў.

4. Пры разглядзе паэзіі У. Караткевіча, у прыватнасці вершаў на гістарычную тэму, магчымы наступны варыянт у формах выкладання:

а) зварот да азначэння «мастацкая версія гістарычнага факту»;

б) кароткія (з дапамогай канспектаў, зробленых у IX класе) паведамленні вучняў аб жыцці і творчасці П. Багрыма, К. Каліноўскага. Змест гэтай формы можна паглыбіць: зрабіць паўтарэнне адпаведнага пытання да выпускнога экзамену;

в) дапаўненне настаўніка аб новых фактах з жыцця П. Багрыма [6];

г) чытанне вершаў «З а й г р а й, з а й г р а й, х л о п ч а м а л ы ...» П. Багрыма, «М а р ы с ь к а ч а р н а б р о в а, г а л у б к а м а я ...» К. Каліноўскага, гутарка па іх;

д) літаратуразнаўчы аналіз вершаў У. Караткевіча «П а ў л ю к Б а г р ы м», «Н я в е с ц е К а л і н о ў с к а г а»: мастацкая версія гістарычнага факту;

У працэсе гутаркі паводле верша «Нявесце Каліноўскага» мэтазгодна звярнуцца да характарыстыкі канцэптуальнага мастацкага асвятлення У. Караткевічам гісторыі беларускага народа. Гэта можна здзейсніць шляхам звароту да трагедыі «К а с т у с ь К а л і н о ў с к і. С м е р ц ь і н е ў м і р у ч а с ц ь» (прызнанні Кастуся Марыі) [7], рамана «К а л а с ы п а д с я р п о м т в а і м» (гутаркі Каліноўскага і Загорскага) [8]. Больш шырока гэта можна праілюстраваць праз тлумачэнне ідэйнага зместу трагедыі «М а ц і У р а г а н у», раманаў «Н е л ь г а з а б ы ц ь», «Х р ы с т о с п р ы з я м л і ў с я ў Г а р о д н і», «Ч о р н ы з а м а к А л ь ш а н с к і» і інш.

е) параўнальны аналіз мастацкага выкладу легенды аб Машэку ў паэме «М а г і л а л ь в а» Я. Купалы і верш «М а ш э к а» У. Караткевіча;

ж) абагульненні і вывады;

з) у працэсе літаратуразнаўчага аналізу «Каласоў пад сярпом тваім» паралельна з работай па адпаведнай тэме мэтазгодна высвятляць суадносіны рэальнага гістарычнага і мастацкага, рабіць фактуальныя назапашванні, якія затым дазволяць вучням больш якасна засвоіць паняцце «гістарычны раман».

Праведзеная папярэдне характарыстыка твораў У. Караткевіча, работа па засваенні паняццяў «мастацкая версія гістарычнага факту», «гістарычны раман» будуць спрыяць больш якаснаму дыферэнцаванаму вывучэнню гістарычнай тэмы ў сучаснай беларускай прозе. У прыватнасці, наступных яе частак:

а) творы, якія грунтуюцца на спалучэнні рэальна-гістарычнага і прыдуманага з адпаведным ухілам у бок першага альбо другога («С л е д в а ў к а л а к а» Л. Дайнекі, «П р а д с л а в а» В. Іпатавай, «П р ы а п а з н а н н і — з а т р ы м а ц ь» В. Хомчанкі);

б) творы, падзеі, характары якіх разгортваюцца і «жывуць» на фоне канкрэтнай гістарычнай абстаноўкі, але маюць прыдуманую аснову (напрыклад, «З а м о р а м Х в а л ы н с к і м» В. Іпатавай).

**Тэарэтычная аснова фармавання ўменняў і навыкаў аналізу мастацкага стылю пісьменніка.**

Этапны пачатак гэтага кірунку павінен адбывацца яшчэ ў сярэдняй школе. Аднак якаснае фармаванне ўменняў і навыкаў аналізу мастацкага стылю пісьменніка магчыма ў XI класе, калі вучні маюць адносна дастатковую колькасць ведаў па гісторыі, тэорыі літаратуры. Задача настаўніка ў працэсе вывучэння творчасці, скажам, І. Мележа, У. Караткевіча, Я. Брыля, В. Быкава, І. Шамякіна і іншых пісьменнікаў звяртаць увагу не толькі на практычны бок (канкрэтнае вызначэнне стылёвых прыкмет), а і на тэарэтычныя перадумовы такога віду дзейнасці. У гэтым сэнсе, думаецца, можна звярнуцца да разважанняў наступнага зместу:



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Яшчэ ў 20-я гг. літаратуразнаўцы (В. Жырмунскі, В. Пераверзеў, П. Сакулін) акцэнтавалі ўвагу на тым, што стыль надае цэласнасць мастацкаму твору, з'яўляецца ўстойлівай агульнасцю вобразнай сістэмы. Пра гэта пішуць і многія сучасныя літаратуразнаўцы (С. Андраюк, Г. Паспелаў, А. Сакалоў, А. Яскевіч)[9], з вывадаў якіх часта вынікае, што стыль — гэта пэўная мастацкая дасканаласць, характэрная для пэўнага твора ці ўсіх твораў аднаго аўтара (вобразная змястоўная структура з адзінствам зместу і формы). Звяртаецца таксама ўвага і на тое, што адзінства і цэльнасць зместу і формы, мастацкіх сродкаў з'яўляецца асноўным законам стылю. Пры гэтым, аднак, неабходна ўлічваць, што праблема стылю звязана з працэсам камунікацыі з улікам двух яе бакоў: які перадае і які ўспрымае. Варыянтнасць успрымання аднаго і таго ж твора, якая мае і канкрэтна-гістарычную абумоўленасць, што ўздзейнічае на ацэнку нестылёвых асаблівасцей твораў, часта прыводзіць да таго, што ў разрад творчых хібаў пісьменніка (у тым ліку і стылёвых) узводзяцца менавіта мастацкія вартасці твораў у іх філасофскім сэнсе. Прыкладам гэтаму — адносіны да творчасці Цёткі, А. Мрыя, Я. Купалы, У. Караткевіча, В. Быкава, М. Сяднёва, А. Ахматавай, М. Гумілёва, Б. Пастарнака, А. Платонава і інш.

Кожная эпоха вылучае на першы план як сапраўды мастацкія творы, так і даволі пасрэдныя, далёкія ад устойлівасці і змястоўнасці іх вобразнай структуры. І тым не меней, і першыя, і другія пабудаваны на пэўных законах, маюць свае асаблівасці, таму ёсць сэнс гаварыць пра стыль і тых, і другіх твораў.

Выходзячы з гэтага, даем азначэнне індывідуальнага стылю пісьменніка:

**Стыль пісьменніка** — гэта своеасаблівая (можа быць — таленавіта-арыгінальная) сістэма выяўленчых прыёмаў і сродкаў, з дапамогай пэўных сукупнасцей якіх, узаемаўплываў яе частак мастак асэнсоўвае ў межах аднаго ці некалькіх твораў, пэўнага перыяду ці ўсёй сваёй творчасці рэчаіснасць у яе гістарычнай канкрэтнасці; гэтая сістэма дазваляе (ці перашкаджае) пранікаць у сутнасць аналізуемых з'яў, дасягаць мастацкай дасканаласці твораў; яна дазваляе (або перашкаджае) рэцыпіенту мастацкага твора, пэўнага перыяду ці ўсёй творчасці пісьменніка больш поўна спасцігаць чалавека, рэчаіснасць у іх гістарычнай і маральнай сутнасці.

---

[1] **Праграма-праспект** па беларускай літаратуры... // Роднае слова. 1993. № 3.— С. 55—58.

[2] **Праграма** сярэдняй школы. Беларуская мова і літаратура...— Мн., 1992.— С. 78.

[3] **Грамадчанка Т.** Асцярожна перагорнем старонкі... // Літаратура і мастацтва. 1989. 23 чэрв.— С. 6—7.

**Ленсу А.** Яшчэ раз пра Міхала Тварыцкага // Тамсама.— С. 6—7.

**Мушынскі М.** Ці быў Міхал Тварыцкі ворагам народа // Літаратура і мастацтва. 1989. 27 студз.— С. 5, 6—7.

[4] **Жук І.** Нявольнік лёсу. Спроба рэабілітацыі літаратурнай традыцыі // Літаратура і мастацтва. 1990. 2 сак.— С. 14—15.

[5] **Мушынскі М.** «Зямля — гэта частка чалавечай душы» (Раман Кузьмы Чорнага «Зямля» ў сучасным успрыманні) // Літаратура і мастацтва. 1991. 15 лют.— С. 8—9.

**Мушынскі М.** Неспатоленая прага праўды (Да 90-годдзя з дня нараджэння Кузьмы Чорнага) // Літаратура і мастацтва. 1990. 22 чэрв.— С. 9.

[6] **Крук У., Марціновіч А.** Стаў Багрым легендай // Літаратура і мастацтва. 1992. 23 кастр.— С. 12.

**Янушкевіч Я.** «Ледзве здымкі ўратаваў...» (Новае пра сям'ю Паўлюка Багрыма) // Літаратура і мастацтва. 1988. 4 ліст.— С. 16.

**Паўлюк Багрым** / Пад рэд. А. Сабалеўскага. Укладальнікі В. Ляшук, А. Майсейчык.— Мн., 1994.

[7] **Караткевіч У.** Кастусь Каліноўскі. Смерць і неўміручасць / Караткевіч У. Збор твораў: у 8-мі т.— Мн., 1987. Т. 1.— С. 64—65.

[8] **Тамсама.** — Т. 4.— С. 320, 322—323.

[9] **Стыль пісьменніка** / Зб. арт. Рэд. В. Барысенка.— Мн., 1974.

**Поспелов Г. Н.** Проблемы литературного стиля.— М., 1970.

**Соколов А. Н.** Теория стиля.— М., 1968.

**Яскевіч А. С.** Карані маладога дрэва.— Мн., 1967.

**Яскевіч А. С.** Стыль // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5-ці т. Т. 5.— Мн., 1987.— С. 150—151.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова